СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ! | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

Библиотека АН БССР

# БОЛЬШЭВІК

Орган Капаткевіцкага РК КП(б)Б

№ 11 (753) | Аўторак, 15 чэрвеня | 1943 г.

**Вораг ужо адчуў сілу сакрушальных удараў нашых войск. Блізіцца час, калі Чырвоная Армія сумесна з арміямі нашых саюзнікаў зломіць хрыбет фашысцкаму зверу.**

**І. СТАЛІН.**

## НА ВЫПУСК ВАЕННАЙ ПАЗЫКІ АДКАЖАМ НОВЫМІ ЎДАРАМІ ПА ВОРАГУ

5 чэрвеня 1943 г. Урад Саюза ССР выпусціў Другую Дзяржаўную Ваенную Пазыку, сродкі ад якой пойдуць для справы разгрома нямецка-фашысцкіх захопнікаў і аднаўлення народнай гаспадаркі ў раёнах, якія вызвалены ад акупантаў. Пазыка выпушчана на суму 12 мільярдаў рублёў.

З вялікім патрыятычным уздымам сустрэў савецкі народ новую Пазыку. Рабочыя, калгаснікі, савецкая інтэлігенцыя, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі дружна правялі падпіску. Яшчэ к канцу першага дня падпіскі Пазыка была размешчана на 14 мільярдаў 561 мільён рублёў. На 9 чэрвеня сума падпіскі складала 20 мільярдаў 121 мільён рублёў.

Усё для фронта, усё для перамогі — пад такімі заклікамі праходзіць падпіска. Поспех Пазыкі — сведчанне велізарнай сілы савецкага ладу, небывалага маральна — палітычнага адзінства нашага народа, яго згуртаванасці вакол большэвіцкай партыі, Савецкага Ўрада і вялікага Сталіна.

Партызаны і партызанкі! На выпуск Пазыкі адкажам новымі ўдарамі па ворагу. Гэта будзе нашым лепшым узносам на пазыку.

## Магутны ўдар нашай авіяцыі па аэрадромах праціўніка

Вечарам 10 і ў ноч на 11 чэрвеня буйныя злучэнні нашых паветраных сіл нанеслі магутны ўдар па аэрадромах праціўніка. У налёце на варожыя аэрадромы ўдзельнічала больш 500 нашых самалётаў.

У выніку бамбардыроўкі знішчана і пашкоджана па меншай меры 150 нямецкіх самалётаў. Акрамя таго, у паветраных баях у раёне аэрадромаў збіта больш 10 самалётаў праціўніка.

З баявога задання не вярнулася 19 нашых самалётаў.

## Налёты нашай авіяцыі на чыгуначныя вузлы Гомель, Бранск і станцыю Карачэў

У ноч на 13 чэрвеня наша авіяцыя дальняга дзеяння буйнымі сіламі зрабіла налёты на чыгуначныя вузлы Гомель, Бранск і станцыю Карачэў. Бамбардыроўцы падвергліся скапленні эшалонаў праціўніка і склады з боепрыпасамі.

Усе нашы самалёты, акрамя двух, звярнуліся на свае базы.

## Узнагароджанне воінаў Чэхаславацкай часці ў СССР Прэзідэнтам Чэхаславацкай рэспублікі

Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага узброенымі сіламі Прэзідэнта Чэхаславацкай Рэспублікі доктара Эдуарда Бенеша за паспяховае выкананне загадаў камандавання ў барацьбе супроць гітлераўскіх захопнікаў на савецка-германскім фронце і за праяўленыя пры гэтым доблесць і гераізм узнагароджана група камандзіраў і байцоў Чэхаславацкай ваеннай часці ў СССР.

Камандзір Чэхаславацкай базавой ваеннай часці палкоўнік Свабода Л. І. узнагароджан „Чэхаславацкім ваенным крыжам“. Акрамя таго, „Чэхаславацкім ваенным крыжам“ узнагароджаны 90 камандзіраў і байцоў. 77 чалавек узнагароджаны медаллю „За храбрасць“.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

### Заходнее Растова на Дану

Заходнее Растова на Дану праціўнік, сілай да палка пяхоты пры падтрымцы танкаў, атакаваў нашы пазіцыі. Спачатку гітлераўцам удалося пацясніць нашы перадавыя падраздзяленні. Контрударам нашых байцоў гітлераўцы былі адкінуты. У выніку боя праціўнік страціў забітымі да 300 салдат і афіцэраў. Падбіта 5 нямецкіх танкаў.

### У раёне Севска

У раёне Севска наша разведка абнаружыла ля пярэдняга краю праціўніка вялікую групу нямецкіх афіцэраў. Артылерысты Н-скай часці адкрылі агонь і некалькімі залпамі рассеялі і часцю знішчылі гэту групу афіцэраў праціўніка.

### На Заходнім фронце

На Заходнім фронце нашы часці знішчылі да 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў, разбілі многа дзотаў праціўніка.

## За граніцай

11 чэрвеня войскі саюзнікаў занялі востраў Пантэлерыя (у Міжземным моры). Італьянскі гарнізон вострава капітуліраваў. З заняццем вострава Пантэлерыя ў руках войск саюзнікаў аказаліся першыя 30 квадратных міль італьянскай тэрыторыі.

* * *

У Герцагавіне і Чэрнагорыі (Югаславія) працягваюцца жорсткія баі партызан з акупантамі. У аперацыях супроць партызан прымаюць удзел нямецкія рэгулярныя войскі, часці „СС“, павелічаўскія, італьянскія і балгарскія дывізіі. Акупанты і іх пасобнікі нясуць у гэтых аперацыях вялікія страты.

# Будзем біць гітлераўцаў да поўнага іх знішчэння

## Выконваючы сталінскі загад

Партызаны атрада, якім камандуе тав. В., выконваючы першамайскі загад тав. Сталіна, наносяць удар за ударам па камунікацыях ворага і знішчаюць яго жывую сілу.

3-га чэрвеня на чыгунку адправілася дыверсійная група атрада пад камандаваннем тав. Арсеня С. Падыйсці да чыгункі было цяжка. За 500 метраў ад пуці фрыцы нарабілі засады. Па палатну ўвесь час хадзілі патрулі. Але не ўпершыню Арсеню ісці на чыгунку. Незаўважана для фрыцаў ён распалагае сваю групу ля самага палатна і чакае зручнага моманту.

Чакаць прышлося доўга—ледзь не цэлыя суткі. Але ўсё-ж дачакаліся. Пачуўся гул надыходзячага эшалона. Хутка закладаюць адважныя патрыёты міну і адыходзяць у бок.

Раздаўся выбух. Гэта ляцеў пад адкос эшалон з жывой сілай праціўніка. Знішчан паравоз і 9 вагонаў. Пашкоджана 6 вагонаў. Пад абломкамі вагонаў загінула многа нямецкіх салдат і афіцэраў.

**Адам Ц.**— камісар атрада.

## На комсамольскім сходзе

12 чэрвеня адбыўся сход пярвічнай комсамольскай арганізацыі 1-ай роты Н-скага партызанскага атрада. Комсамольцы падвялі вынікі сваёй баявой і палітычнай дзейнасці за месяц. У сваім рашэнні маладыя патрыёты пастанавілі яшчэ мацней наносіць удары па ворагу, палепшыць баявую вывучку, узмацніць сувязі з насельніцтвам.

На сходзе быў прынят у рады ЛКСМБ малады партызан Барыс П. **Іван К.**

## Знішчаем фрыцаў

Група партызан Н-скага атрада ўстанавіла на чыгуначнай лініі супроцьпяхотную міну. Фрыцы, якія ішлі па лініі, міну не заўважылі і ўзарваліся на ёй. Забіта 3 і паранена 2 фрыцы. **Міхась Г.**— партызан Н-скага атрада.

## Павел і яго кулямёт

Бязлітасна знішчае нямецкіх захопнікаў кулямётчык Н-скага атрада Павел Н. Не было таго бою, у якім-бы Павел не ўдзельнічаў. Некалькі дзясяткаў фашысцкіх сабак знайшлі сабе смерць ад меткіх куль, выпушчаных ім.

Добра вывучыў адважны кулямётчык сваю зброю. —Мой кулямёт выбівае чачотачку—гаворыць Павел. І сапраўды. Ніколі кулямёт не адказаў у баю. Заўсёды ён знаходзіцца ў належнай спраўнасці і чыстаце. **Нікалай Ш.**

## Мая гармата—грозная зброя для ворага

Артылерыйскую справу я палюбіў яшчэ ў Чырвонай Арміі. І тут, у партызанскім атрадзе, я таксама артылерыст. Даручаную мне гармату я берагу, як самога сябе. Яна заўсёды гатова да бою.

Мая гармата—грозная зброя для ворага, які ўжо не раз паспрабаваў яе снарадаў. У баю пад населеным пунктам К. я прамой наводкай знішчыў дзве падводы і забіў 6 фрыцаў.

**Анатоль З.**— артылерыст Н-скага атрада.

## Нам пішуць

6 чэрвеня ў рабочым пасёлку Н. адбыўся сход насельніцтва. Прысутнічала больш 100 чалавек. З выключнай увагай быў выслуханы даклад тав. К. на тэму: „Вайна савецкага народа супроць нямецкіх захопнікаў".

—Часцей прыходзьце да нас,— звярнуліся прысутнічаўшыя да партызан. —Мы хочам аб усім ведаць, дзе і як б'юць праклятых фашыстаў.

**Владзімір К.**

* * *

Выдатна працуюць медыцынскія работнікі Н-скага атрада тт. Павел Е., Ольга М., Еўгенія Д. і Ольга С. Яны клапатліва і ўважліва адносяцца да кожнага раненага альбо хворага байца. У памяшканні, дзе знаходзяцца хворыя, светла, чыста і ўтульна. Вялікая медыцынская дапамога аказваецца таксама мясцоваму насельніцтву. **Сцяпан К.**

## Наш уклад у агульную барацьбу

Днямі група партызан-славакаў пад камандаваннем тав. Рудольфа П. пусціла пад адкос нямецкі воінскі эшалон. Знішчан паравоз, пашкоджана 12 вагонаў.

—Кожны ўзарваны намі нямецкі эшалон,— гавораць славакі,—гэта наш уклад у агульную барацьбу славянскіх народаў супроць гітлераўскай Германіі. У брацкім саюзе з рускімі, беларусамі, палякамі і ўсімі іншымі славянамі мы адваюем свабодную дэмакратычную Чэхаславакію. **Леанід Б.**

## 47 гутарак з насельніцтвам

47 гутарак з мірным насельніцтвам правялі агітатары Н-скай партызанскай брыгады на працягу мая месяца. Агітатары расказалі сялянам аб поспехах Чырвонай Арміі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі і аб самаадданай працы рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі на Савецкай Радзіме.

Сяляне ўнеслі дадаткова ў фонд будаўніцтва танкавай калоны „Партызан Палесся" 60 тысяч рублёў.

**Васіль С.**

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Капаткевіцкага РК КП(б)Б